УДК 947.6(075.8)
ББК 63.3 (4Беи)я73
У68

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ, рэкамендавана секцыяй гуманітарных навук
(пратакол № 11 ад 26.05.05 г.)

*Рэцэнзенты:*
доктар гістарычных навук, прафесар, намеснік дырэктара Інстытута гісторыі НАН Беларусі *У. І. Навіцкі;*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі старажытных цывілізацый і сярэдневякоўя БДПУ *У. В. Тугай*

*Складальнікі:*
доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *А. П. Жытко*;
доктар гістарычных навук, прафесар, дэкан гістарычнага факультэта БДПУ *М. М. Забаўскі*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *У. С. Пуцік*;
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі БДПУ *А. Ф. Рацько*;
доктар гістарычных навук, прафесар кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычнай навукі БДПУ *В. М. Фамін*

*Пад агульнай рэдакцыяй* А. П. Жытко

**Гісторыя** Беларусі перыяду капіталізму : вучэб. дапам. У 5 ч. Ч. 1.
У68 Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі / склад. А. П. Жытко [і інш.]; пад агул. рэд А. П. Жытко. – Мн. : БДПУ, 2005. – 138 с.
ISBN-985-501-098-1.

У дапаможніку асвятляюцца найбольш важныя праблемы сацыяльна-аграрнай палітыкі царскага ўрада ў дачыненні да сялянства і памешчыкаў Беларусі на этапе капіталізму.

Адрасаваны студэнтам гістарычнага факультэта БДПУ, можа быць выкарыстаны навукоўцамі і выкладчыкамі вышэйшых навучальных устаноў.

**УДК 947.6(075.8)**
**ББК 63.3 (4Беи)я73**

**ISBN 985-501-098-1** (ч. 1)
**ISBN 985-501-083-3**

© Жытко, А. П. [і інш.], складанне, 2005
© БДПУ, 2005

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка»

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ ПЕРЫЯДУ КАПІТАЛІЗМУ

**Вучэбны дапаможнік**

**У пяці частках**

***Частка 1***

## *Урадавая сацыяльная палітыка ў аграрным сектары эканомікі*

ук 3115
Бібліятэка БДПУ імя М. Танка
РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Мінск 2005

з якім тыя аднадворцы, што жылі на памешчыцкай зямлі, станавіліся арандатарамі па дамове з уладальнікам. Такім чынам, аднадворцы заставаліся ў эканамічнай залежнасці ад памешчыка і ліквідаваліся як саслоўе.

Стараверы з'явіліся ў Беларусі ў XVII–XVIII стст. Калі пачаліся ганенні на іх веру, яны перасяліліся з Расіі і пачалі арандаваць зямлю ў феадалаў за аброк. Па даных за 1882 г., у Магілёўскай губерні налічвалася 16753 стараверы, а ў 1895 г.– 23486. Больш за 2/3 з іх пражывала ў Гомелі і Гомельскім павеце. У канцы XIX ст. у Віцебскай губерні старавераў налічвалася больш за 100 тыс. душ.

Падчас паўстання 1863 г. стараверы выступілі на баку ўрада. Жылі яны адасоблена, захоўвалі сваю веру, рускую мову, традыцыі і не паддаваліся паланізацыі. Мясцовая адміністрацыя спадзявалася выкарыстаць іх як своеасаблівую сілу русіфікацыі краю. Менавіта па гэтай прычыне, калі памешчыкі пачалі высяляць старавераў з арандуемай імі зямлі, Віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў выдаў цыркуляр ад 17 чэрвеня 1863 г., па якім памешчыкам забаранялася пазбаўляць іх зямлі і ўстанаўліваць арэндную плату больш за 3 рублёў з дзесяціны. Але ў пачатку 70-х гг. XIX ст. віленская адміністрацыя з ведама Міністэрства ўнутраных спраў адмяніла цыркуляр. З гэтага часу яны маглі арандаваць зямлю толькі на падставе добраахвотных пагадненняў з памешчыкам.

Згодна з законам ад 22 мая 1876 г., частка старавераў заходніх губерняў замест выкупу зямлі набыла права безтэрміновай арэнды. Выкуп зямлі мог адбыцца толькі па патрабаванні памешчыка або па добраахвотнаму пагадненню бакоў. У гэтым выпадку ўрад выдаваў стараверам пазыку для выкупу зямлі. Пры адмове ад выкупу па патрабаванні памешчыка арандатар павінен быў на працягу года пакінуць памесце, а калі ён адмаўляўся, то высяляўся прымусова.

Такім чынам, вызваленне прыватнаўласніцкіх сялян ад прыгоннай залежнасці і перавод іх у разрад уласнікаў паставілі на чаргу дня пытанне аб пазямельным уладкаванні астатніх груп сельскага насельніцтва. Вырашэнне зямельнага пытання ў парэформенны час залежала ад размаху аграрнага руху гэтых груп сельскага насельніцтва. І калі дзяржаўныя сяляне і вольныя людзі больш упарта і паслядоўна змагаліся за зямлю, то і ўрад вымушаны быў пайсці на задавальненне іх патрабаванняў.

## *Тэсты*

I. Імкненне часткі беларускіх памешчыкаў перайсці да рацыянальных метадаў вядзення гаспадаркі ў першай палове XIX ст. не мела вялікага поспеху па прычыне:



1) адсутнасці свабодных капіталаў;
2) недастатковай колькасці новых відаў зерневых культур;
3) недахопу конных сеялак, веялак, малатарняў, жалезных плугоў;
4) наяўнасці таннай дармавой прыгоннай працы;
5) няўмення панскіх эканомаў весці гаспадарку па-новаму.

II. Аб крызісе феадальна-прыгонніцкай сістэмы ў сярэдзіне XIX ст. на беларускіх землях сведчыла:
1) невялікая колькасць гарадоў і гарадскога насельніцтва;
2) шырокае выкарыстанне сервітутаў;
3) павелічэнне колькасці сельскага насельніцтва;
4) памяншэнне даходнасці памешчыцкіх гаспадарак і хуткі рост іх запазычанасці;
5) павелічэнне колькасці крэдытных устаноў.

III. Фарміраванне сялянскай прыватнай зямельнай уласнасці на тэрыторыі беларускіх губерняў тармазілася ў першай палове XIX ст.:
1) нежаданнем саміх сялян займацца новымі формамі гаспадарання;
2) шырокім распаўсюджваннем сервітутаў на землях Беларусі;
3) «прыроднай лянотай» саміх беларускіх сялян;
4) манаполіяй памешчыцкага землеўладання і прыгонным правам;
5) увядзеннем у нашым краі інвентароў.

IV. Ініцыятыва адмены прыгоннага права пасля паражэння Расіі ў Крымскай вайне зыходзіла ад:
1) Міністэрства абароны краіны;
2) расійскіх памешчыкаў;
3) рускай праваслаўнай царквы;
4) царскага ўрада;
5) расійскай інтэлігенцыі.

V. Праект Міністэрства ўнутраных спраў Расіі аб вызваленні сялян ад прыгону (1856 г.) прадугледжваў:
1) вызваліць сялян з надзяленнем іх сядзібнай і ворнай зямлёй;
2) вызваліць сялян без зямлі, з надзяленнем іх адной толькі сядзібай;
3) вызваліць сялян з прадастаўленнем ім кампенсацыі за зямлю;
4) вызваліць сялян з прадастаўленнем ім права арэнды сядзібнай і ворнай зямлі;
5) вызваліць сялян без надзялення іх якой-небудзь зямлёй.

VI. Урад вырашыў арганізаваць ініцыятыву адмены прыгону з боку беларуска-літоўскіх памешчыкаў па прычыне:
1) іх больш высокай адукаванасці;
2) блізасці іх уладанняў да адукаванай Еўропы;



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

3) большай уцягнутасці іх уладанняў у сферу таварна-грошавых адносін і большай падрыхтаванасці да адмены прыгону;
4) большага жадання іх сялян пазбавіцца прыгону.

VII. Па царскаму рэскрыпту віленскаму генерал-губернатару В. Назімаву прадугледжвалася:
1) надзяліць сялян сядзібнай зямлёй без выкупу;
2) надзяліць сялян толькі сядзібнай зямлёй, але за выкуп;
3) прадаставіць сялянам сядзібны надзел без аброкаў і паншчыны;
4) даць сялянам сядзібную і ворную зямлю без выкупу, але з адбываннем паншчыны і выплатай аброку.

VIII. Кансерватыўна-рэакцыйная «большасць» губернскіх камітэтаў адстойвала выгадны для сябе «прускі» варыянт рэформы:
1) вызваленне сялян з зямлёю за выкуп;
2) вызваленне сялян з зямлёю без выкупу;
3) вызваленне сялян з зямлёю з умераным выкупам;
4) вызваленне сялян без зямлі і за выкуп;
5) вызваленне сялян без зямлі і без выкупу.

IX. Памешчыкі Мазырскага і Рэчыцкага паветаў, землі якіх былі малаўрадлівыя і не ўяўлялі вялікай каштоўнасці, выказаліся за:
1) надзяленне сялян зямлёй без выкупу;
2) надзяленне сялян зямлёй за выкуп;
3) беззямельнае вызваленне сялян і за выкуп;
4) беззямельнае вызваленне сялян і без выкупу.

X. Ніжэйшая і вышэйшая нормы надзелаў вызначаліся ў губерні:
1) Віленскай;
2) Гродзенскай;
3) Мінскай;
4) Магілёўскай.

XI. Рэдакцыйных камісій, якія перапрацоўвалі шматлікія праекты губернскіх камітэтаў, было:
1) 5;
2) 4;
3) 3;
4) 2;
5) 1.

XII. Першапачаткова (сакавік 1859 г.– люты 1860 г.) рэдакцыйныя камісіі ўзначальваў блізкі да Аляксандра II чыноўнік, прыхільнік урадавай лініі:
1) В. Назімаў;
2) М. Мураўёў;



3) В. Панін;
4) Я. Растоўцаў;
5) С. Ланской.

XIII. У адпаведнасці з «Палажэннямі» 19 лютага 1861 г. устанаўліваўся тэрмін часоваабавязанага становішча сялян у:
1) 1 год;
2) 2 гады;
3) 5 гадоў;
4) 9 гадоў;
5) 12 гадоў.

XIV. «Палажэнні» 19 лютага 1861 г. абавязвалі памешчыка:
1) надзяліць сялян палявым надзелам за выкуп;
2) прадаць сваім былым прыгонным частку зямлі на пэўных умовах;
3) даць сялянам палявы надзел, якім ён карыстаўся да адмены прыгону ва ўласнасць без выкупу;
4) бясплатна аддаць былым прыгонным сядзібную зямлю.

XV. Праверку, зацвярджэнне і ўвядзенне ў дзеянне ўстаўных грамат ажыццяўляў:
1) памешчык;
2) сельская абшчына (грамада);
3) міравы пасрэднік;
4) сельскі стараста;
5) павятовы міравы з'езд.

XVI. Дакумент, які вызначаў памеры адведзенай сялянам зямлі, ацэнку сядзібы на выпадак яе выкупу, а таксама спаганяемыя за карыстанне зямлёй павіннасці, называўся:
1) выкупны акт;
2) сервітут;
3) выкупны плацёж;
4) устаўная грамата;
5) «мясцовае палажэнне».

XVII. У выніку паўстання 1863 г. на беларуска-літоўскіх землях у кожным павеце для праверкі грашовых павіннасцей і складання выкупных актаў былі створаны:
1) рэдакцыйныя камісіі;
2) паверачныя камісіі;
3) павятовыя камісіі;
4) павятовыя міравыя з'езды.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

XVIII. Вопіс казённых зямель з мэтай вызначэння іх даходнасці называецца:
1) перапіс;
2) сервітут;
3) люстрацыя;
4) рэгістрацыя.

XIX. Катэгорыя сялян, пераважная большасць якой у сярэдзіне XIX ст. пражывала на захадзе і поўначы Беларусі і за карыстанне зямлёй плаціла ў казну грашовы аброк, называлася:
1) вольныя людзі;
2) сельскія чыншавікі;
3) дзяржаўныя сяляне;
4) аднадворцы;
5) старaверы.

### *Літаратура*


1. Бейлькін Х. Ю. Асаблівасці правядзення рэформы 1861 г. у Беларусі // Беларускі гістарычны часопіс. 2001. № 4.
2. Белоруссия в эпоху капитализма. У 3 т. Мн., 1983. Т.1.
3. Нарысы гісторыі Беларусі. У 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1.
4. Великая реформа. Русское общество и крестьянский вопрос в прошлом и настоящем. В 2 т. М., 1911. Т. 2.
5. Гісторыя Беларускай ССР. У 5 т. Мн., 1972. Т. 2.
6. Гісторыя сялянства Беларусі са старажытных часоў да нашых дзён. У 3 т. Мн., 2002. Т. 2.
7. Дакументы і матэрыялы па гісторыі Беларусі (1772–1903). У 4 т. Мн., 1940. Т. 2.
8. Доўнар-Запольскі М. В. Гісторыя Беларусі. Мн., 1994.
9. Дружинин Н. М. Русая деревня на переломе (1861–1880 гг.) М., 1978.
10. Зайенчковский П. А. Отмена крепостного права в России. М., 1954.
11. Зайнчковский П. А. Проведение в жизнь крестьянской реформы. М., 1958.
12. Захаров Л. Г. Самодержавие и отмена крепостного права в России. М., 1984.





13. З гісторыі эканамічных рэформаў на Беларусі. У 2 вып. Мн., 1997. Вып. 2.
14. Каліноўскі К. За нашу вольнасць : Творы, дакументы. Мн., 1993.
15. Липинский Л. П. Развитие капитализма в сельском хозяйстве Белоруссии. Мн., 1971.
16. Литвак Б. Г. Переворот 1861 г. в России: почему не реализовалась реформаторская альтернатива. М., 1991.
17. Панютич В. П. Социально-экономическое развитие белорусской деревни в 1961–1900 гг. Мн., 1990.
18. Улащик Н. Н. Предпосылки крестьянской реформы 1861 г. в Литве и Западной Белоруссии. М., 1956.
19. Фридман М. Б. Отмена крепостного права в Белоруссии. Мн., 1958.
20. Эканамічная гісторыя Беларусі. Мн., 1995.




РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ